# АБУТКОВЫЯ ПАДКОЎКІ XV – XVIII СТАГОДДЗЯЎ
## (ПА МАТЭРЫЯЛАХ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ У ГОРАДЗЕ ПОЛАЦКУ Ў 2000 – 2008 ГАДЫ)

***І.У. МАГАЛІНСКІ***
***(Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік)***

*На падставе аналізу рэчавых крыніц і навуковай літаратуры ў артыкуле робіцца спроба стварэння тыпалагічнай схемы развіцця абутковых падковак па матэрыялах археалагічнага вывучэння г. Полацка ў 2000 – 2008 гадах. У ходзе даследавання робіцца выснова, што самымі важнымі крытэрыямі вылучэння асобных тыпаў і відаў дадзенай катэгорыі артэфактаў з'яўляюцца форма аснавання і спосаб яго мацавання да абцаса. Разглядаючы спосаб мацавання ў якасці характарыстыкі, вытворнай ад формы аснавання, аўтар прапануе новы варыянт тыпалогіі абутковых падковак, заснаваны на карэляцыі абодвух гэтых крытэрыяў.*

**Уводзіны.** Адну з найбольш прадстаўнічых частак калекцыі полацкіх чорнаметалічных артэфактаў, што захоўваецца ў фондах Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка (далей – НПГКМЗ), складаюць абутковыя падкоўкі. Абутковая падкоўка – гэта найбольш універсальнае прыстасаванне для абароны абцасаў абутку ад сцірання. Гэтая група артэфактаў мела важнае функцыянальнае прызначэнне і праіснавала да апошніх дзесяцігоддзяў XX ст., калі патрэба ў ёй адпала ў сувязі з выкарыстаннем для вырабу абутковых абцасаў сучасных высокатрывалых матэрыялаў [1]. Абутковыя падкоўкі ўяўляюць сабой узор масавай вытворчасці, якая павінна была задаволіць патрэбы ў гэтым відзе вырабаў кожнага жыхара горада. Дадзеная акалічнасць абумовіла вялікую частату іх выяўлення ў позне-сярэднявечных слаях беларускіх гарадоў, у тым ліку і ў Полацку (у сярэднім па адным экземпляры на кожныя 4 кв. м напластаванняў XVII – XVIII стст.) [2, с. 156]. Натуральна, што масавы характар вырабу абутковых падковак прадугледжваў існаванне дастаткова ўстойлівых іх форм, якія змяняліся ў адпаведнасці са зменай формы саміх абцасаў. У сувязі з гэтым узнікае магчымасць вылучэння з усяго масіву дадзенай катэгорыі вырабаў пэўных відаў і тыпаў паводле часу бытавання, функцыянальных і марфалагічных прыкмет. Створаную на гэтай глебе тыпалагічную схему полацкіх абутковых падковак можна будзе выкарыстоўваць у якасці важнага дапаможнага сродка для датыроўкі культурнага слоя не толькі Полацка, але і іншых беларускіх гарадоў.

У гэтай рабоце прапануецца новы варыянт тыпалогіі абутковых падковак з г. Полацка. Адпаведна, асноўным матэрыялам для напісання артыкула паслужылі вырабы, якія былі выяўлены падчас археалагічных даследаванняў горада за 2000 – 2008 гады (археалагічнае вывучэнне праводзілася экспедыцыямі ІГ НАН Беларусі пад кіраўніцтвам Д.У. Дука) [3, 4]. Акрамя таго, пэўная частка рэчавых матэрыялаў, выкарыстаных у працы, была ўзята з прыватнай калекцыі навуковага супрацоўніка навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НПГКМЗ А.А. Салаўёва, якая ў цяперашні час захоўваецца ў фондах запаведніка. Для аналізу і навуковай апрацоўкі намі былі адабраны толькі падкоўкі найбольш добрай захаванасці, якія дазваляюць зрабіць максімальную колькасць дакладных статыстычных вымярэнняў і падлікаў. Дзякуючы гэтаму стала магчымым улічыць розныя варыянты падковак (усяго звыш 50 экземпляраў), што дазволіла павысіць узровень навуковай аб'ектыўнасці зробленых у працы высноў.

Такім чынам, мэтай работы з'яўляецца стварэнне тыпалогіі абутковых падковах па матэрыялах археалагічных даследаванняў г. Полацка ў 2000 – 2008 гады. Для яе вырашэння ставяцца наступныя задачы:

1) прааналізаваць асноўныя падыходы даследчыкаў да пытання тыпалогіі абутковых падковак;
2) вылучыць асноўныя крытэрыі падзелу гэтай катэгорыі вырабаў на асобныя віды і тыпы;
3) стварыць тыпалогію абутковых падковак.

**Гістарыяграфія.** Нягледзячы на вялікую значнасць дадзенай групы артэфактаў для датыроўкі культурнага слоя і комплексаў знаходак, пэўную ўвагу на яе пачалі звяртаць толькі ў адносна нядаўні час. Гэта звязана з тым, што ў ранейшы перыяд развіцця археалагічнай навукі найбольшае значэнне надавалася вывучэнню помнікаў і артэфактаў старажытнарускага часу, тады як познесярэднявечныя матэрыялы заставаліся па-за ўвагай навукоўцаў. Для вызначэння кола характарыстык абутковых падковак, якія могуць скласці аснову для стварэння тыпалогіі гэтай катэгорыі вырабаў, разгледзім падыходы розных даследчыкаў да іх вылучэння.

Адным з першых у кантэксце даследавання жалезаапрацоўваючага рамяства старажытнага Ноўгарада ўвагу азначанай праблеме надаў Б.А. Колчын. За аснову тыпалагізацыі ім быў прыняты спосаб мацавання падковак да абцаса, на падставе якога даследчыкам было вылучана два тыпы вырабаў: 1) на шыпах; 2) на цвіках. Першы тып ён звязваў з абуткам на звычайным шырокім абцасе, а другі – з абуткам на вузкім, высокім абцасе. Па Б.А. Колчыну, абодва тыпы існавалі ў XIV – XV стагоддзях, прычым падкоўкі «на цвіках» ён лічыў больш познімі [5, с. 108, 110].

У кантэксце вывучэння скуранай вытворчасці старажытнага Ноўгарада пэўную ўвагу абутковым падкоўкам надала С.А. Ізюмава, якая назвала іх «жалезнымі абцасавымі набойкамі» і аднесла з'яўленне гэтай катэгорыі вырабаў да XIV стагоддзя [6, с. 214].

Адна з першых спецыяльных прац па гісторыі кавальскага рамяства і яго прадукцыі ў XVI – XVII стагоддзях была напісана А.У. Нікіціным. Ім была праведзена спроба тыпалагізацыі абутковых падковак па спосабу мацавання іх да абцаса. Як і Б.А. Колчын, А.У. Нікіцін вылучае падкоўкі для высокіх (набіўныя) і нізкіх (уразныя) абцасаў, але акрамя гэтага ўказвае на існаванне яшчэ аднаго тыпу – камбінаваных падковак. Вырабы такога кшталту мацаваліся з дапамогай не толькі шыпоў, але і цвікоў і з'яўляліся, як падаецца, пераходным тыпам ад уразных да набіўных падковак [7, с. 42].

Праблема вылучэння найбольш важных характарыстык абутковых падковак, неабходных для стварэння надзейнай тыпалагічнай схемы іх развіцця, прывяло да спробы комплекснага аналізу дадзенай катэгорыі вырабаў. Такі аналіз быў прапанаваны расійскімі археолагамі А.Г. Векслерам, Ю.А. Ліхтэрам і Д.А. Осіпавым у сумесным артыкуле [1]. Абапіраючыся на матэрыялы раскопак г. Масквы, аўтары прапанавалі некалькі тыпалогій абутковых падковак, заснаваных на карэляцыі найбольш важных іх характарыстык. Такі падыход дазволіў не толькі ўлічыць усе магчымыя варыянты форм падковак, але спрагназіраваць і такія, якія пакуль яшчэ невядомыя археалагічнай навуцы. Калі прагнозы даследчыкаў будуць падмацаваныя рэальнымі знаходкамі, то гэтую схему будзе варта браць за ўзор усім археолагам.

У беларускай археалагічнай навуцы адну з першых спроб стварэння тыпалагічнай схемы развіцця абутковых падковак на матэрыялах раскопак г. Віцебска зрабіла В.М. Ляўко. Пры падзеле гэтай групы вырабаў на асобныя тыпы ёю ўлічваўся не толькі спосаб мацавання іх да абцасу, але і характарыстыкі формы аснавання (вышыня і шырыня). Даследчыцай было вылучана два віды падковак: 1) з шыпамі і 2) з адтулінамі. Кожны з відаў у сваю чаргу падзяляецца на тры тыпы ў залежнасці ад формы аснавання і ступені ахопу абцаса. Абутковыя падкоўкі з Віцебска, арыентуючыся на наўгародскія матэрыялы, В.М. Ляўко датуе XIV – XVIII стагоддзямі [8, с. 48]. У прыведзенай тыпалогіі найбольш важным крытэрыем лічыцца спосаб мацавання падкоўкі да абцаса абутку, у той час як іншыя яе прыкметы выступаюць у ролі другасных, што ствараюць аснову для вылучэння больш дробных таксанамічных катэгорый паводле характарыстык аснавання.

Акадэмічная версія тыпалогіі абутковых падковак прадстаўлена ў адпаведным артыкуле Г.М. Сагановіча, які размешчаны ў 4 томе фундаментальнай «Археалогіі Беларусі», а таксама ў шэрагу яго артыкулаў і спецыяльных даследаванняў [9 – 12]. Крытэрыямі падзелу гэтай групы артэфактаў на тры тыпы, па меркаванню аўтара, з'яўляюцца спосаб мацавання да абцаса, форма аснавання і папярочнае сячэнне дугі. Г.М. Сагановіч вылучае тры тыпы падковак: 1) з высокай пласцінападобнай асновай, выгнутай у дугу па перыметры абцаса, з трыма шыпамі; 2) дугападобныя шыпавыя падкоўкі, аснова якіх сплюшчана гарызантальна і мае сячэнне прамавугольніка ці квадрата; 3) бясшыпныя падкоўкі [9, с. 271].

На сучасным этапе развіцця археалагічнай навукі даследчыкі матэрыяльнай культуры беларускіх гарадоў XV – XVIII стагоддзяў пастаянна звяртаюць увагу на дадзеную групу вырабаў з чорных металаў, распрацоўваючы іх тыпалогію [13, 14]. Так, В.С. Пазднякоў на матэрыялах археалагічных даследаванняў старажытнага Клецка вылучыў 5 груп абутковых падковак (за аснову іх вылучэння былі ўзяты форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса): 1) падкоўкі, моцна сплюшчаны па вертыкалі, з трыма шыпамі (XVI - XVII стст.); 2) пласцінкі, утвораныя квадратным у сячэнні дротам (XVI ст.) з трыма шыпамі; 3) пляскія гарызантальныя пласціны з трыма шыпамі (XVII ст.); 4) квадратныя ў сячэнні пласціны з трыма адтулінамі (XVII – XVIII стст.); 5) плоскія, гарызантальныя з чатырма адтулінамі для цвікоў (XVIII - XIX стст.) [15, с. 67 – 68].

У кантэксце нашага даследавання найбольшую цікавасць уяўляюць спробы тыпалагізацыі абутковых падковак, якія былі праведзены на полацкіх матэрыялах. Першая такая спроба была прадстаўлена ў сумесным артыкуле Д.У. Дука і А.А. Салаўёва аб гарбарным рамястве Полацка XVI – XVIII стагоддзяў. У дадзенай працы была прапанаваная адмысловая тыпалогія абутковых падковак, заснаваная на ступені ахопу абцаса, спосабе мацавання і форме пласціны. Паводле першага крытэрыя аўтарамі былі вылучаныя тры варыянты падковак («А», «Б», «В»), якія ў сваю чаргу падзяляліся на тры тыпы ў залежнасці ад формы пласціны і спосабу яе мацавання да абцаса [16].

Яшчэ адна спроба тыпалогіі абутковых падковак з Полацка прадстаўлена ў манаграфіі Д.У. Дука «Полацк XVI – XVIII стст.: нарысы...». У дадзенай рабоце галоўнымі крытэрыямі былі абраны спосаб мацавання падковак да абцасу і форма аснавання. На гэтай падставе вылучаюцца чатыры тыпы вырабаў: 1) высокія з пласцінчатай асновай, якія мацаваліся пры дапамозе трох шыпоў (XV – XVI стст.); 2) дугападобныя, шыпавыя з квадратнай у сячэнні асновай (XVI – XVII стст.); 3) камбінаваныя (XVII – XVIII стст.); 4) набіўныя (XVII – XVIII стст.) [2, с. 156 – 157].

Такім чынам, за перыяд даследаванняў абутковых падковак у савецкай і найноўшай беларускай археалагічнай навуцы не склалася адзінага погляду на крытэрыі падзелу гэтай групы артэфактаў на асобныя тыпы. Амаль кожны даследчык матэрыяльнай культуры беларускага познесярэднявечнага гораду імкнецца стварыць сваю тыпалогію, заснаваную на самастойна вылучаных крытэрыях, якія б у найбольш поўнай ступені раскрывалі натуральныя сувязі, рэальна існуючыя паміж асобнымі экземплярамі дадзенай катэгорыі вырабаў. Між тым такая стракатасць падыходаў не з'яўляецца крокам назад у вырашэнні праблемы. На нашу думку, яна толькі набліжае магчымасць стварэння найбольш прыймальнай тыпалагічнай схемы развіцця не толькі для абутковых падковак, але і іншых груп артэфактаў.

**Асноўная частка.** З усіх крытэрыяў, што склалі б надзейную аснову для стварэння аптымальнай тыпалогіі абутковых падковак, паспрабуем вылучыць тыя, якія найбольш часта выкарыстоўваюцца айчыннымі і замежнымі навукоўцамі пры стварэнні ўласных схем: 1) спосаб мацавання падкоўкі да абцаса; 2) форма аснавання (вышыня, шырыня, таўшчыня, папярочнае сячэнне); 3) ступень ахопу абцаса. Найбольш істотнымі, з функцыянальнай кропкі гледжання, падаюцца першыя два. Ступень ахопу абцаса на нашу думку не з'яўляецца вызначальнай характарыстыкай абутковых падковак, бо яна дубліруецца іншымі, больш універсальнымі прыкметамі.

Такім чынам, асновай для вылучэння храналагічных і функцыянальных груп сярод гэтай катэгорыі вырабаў будуць служыць такія характарыстыкі як форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса. Між тым для таго, каб пазбегнуць парушэння аднаго з галоўных правілаў лагічнай працэдуры дзялення (дзяленне павінна праводзіцца толькі па адным аснаванні) у якасці асновы падзелу абутковых падковак на віды і тыпы варта ўзяць толькі адзін з крытэрыяў [17, с. 115]. У нашым даследаванні такой характарыстыкай будзе з'яўляцца форма аснавання падкоўкі. Натуральна, што дадзеная прыкмета не з'яўляецца аднароднай, складаючыся з некалькіх (вышыня, форма выгіну, шырыня, сячэнне). Найбольш важнай з функцыянальнай і храналагічнай кропкі гледжання ўяўляецца размяшчэнне аснавання ў прасторы – у вертыкальнай ці гарызантальнай плоскасці. Менавіта гэтая характарыстыка пакладзена ў аснову падзелу падковак на асобныя віды, у той час як іншыя параметры формы аснавання выкарыстоўваюцца для вылучэння варыянтаў. Спосаб мацавання абутковых падковак да абцаса ў нашым даследаванні разглядаецца як характарыстыка, вытворная ад формы аснавання і непасрэдна з ёй звязаная.

Прызнаючы форму аснавання вядучай характарыстыкай абутковай падкоўкі, мы зыходзілі з функцыянальнай значнасці таго ці іншага яе элементу. У сувязі з гэтым варта адзначыць, што форма аснавання адыгрывала найбольш важную ролю ў выкананні падкоўкай сваіх функцыянальных задач, бо менавіта дадзеная частка вырабу непасрэдна адказвала за захоўванне цэласнасці абцаса пры яго кантакце з зямлёй. Такім чынам, спосаб мацавання варта разглядаць выключна як вытворную характарыстыку, што знаходзілася ў прамой залежнасці ад формы аснавання. На нашу думку, такі падыход у найбольш поўнай ступені адлюстроўвае натуральныя ўзаемасувязі, што існуюць паміж асобнымі экземплярамі гэтай катэгорыі вырабаў.

Для стварэння тыпалогіі будзем карыстацца наступнымі тэрмінамі: від, варыянт, тып, падтып. Асновай вылучэння відаў і тыпаў з'яўляецца наяўнасць у калекцыі не менш як трох абутковых падковак з аднолькавымі марфалагічнымі і функцыянальнымі характарыстыкамі [18]. Вырабы, якія былі сустрэты намі ў адзінкавых экземплярах, у тыпалогіі ўлічаны не былі.

Уся маса абутковых падковак з Полацка падзяляецца на два вялікія віды паводле размяшчэння аснавання (пласціны) ў прасторы:

I. Пласціна, сплюшчаная ў вертыкальнай плоскасці.

II. Пласціна, сплюшчаная ў гарызантальнай плоскасці (малюнак).

Дадзеныя прыкметы ў найбольшай ступені характарызуюць функцыянальныя і храналагічныя адрозненні паміж падкоўкамі.

Так, падкоўкі першага віду (від I) уяўляюць сабой высокую, трохшыпную пласціну. Акрамя сваёй галоўнай функцыі – ахоўвання абцасу ад сцірання – яна выконвала яшчэ і дадатковую – прымацоўвала яго скураныя пласцінкі да падэшвы (малюнак: 1 – 4).

Другі від (малюнак: 5 – 19) уключае ў сябе падкоўкі з аснаваннем, сплюшчаным у гарызантальнай плоскасці. Падкоўкі з пласцінамі вышэй за 1 см (уключна) будзем адносіць да віду I.

У межах віду II выдзяляецца некалькі варыянтаў паводле сячэння аснавання і яго шырыні. Варыянт II.1. (малюнак: 5 – 13) характарызуецца чатырохграннай пласцінай (сюды ўваходзяць квадратныя і прамавугольныя ў сячэнні пласціны, не шырэйшыя за 1 см), а варыянт II.2. – шырокай і плоскай пласцінай (малюнак: 14 – 19).

Гэтыя віды дастаткова добра карэлююцца з адпаведнымі тыпамі і падтыпамі паводле спосабу мацавання да абцаса (табліца). Тып А (малюнак: 5 – 11, 14 – 16) уяўляе сабой т. зв. «уразныя» падкоўкі, якія мацаваліся да абцаса з дапамогай двух (тып А I) ці трох (тып А II) шыпоў. Дадзены спосаб мацавання быў характэрным не толькі для падковак віду I, але і для віду II. Прычым падкоўкі тыпу А I (малюнак 1: 5 – 7) былі ўласцівыя толькі для віду II.1.

Тып В (малюнак: 18) з'яўляецца пераходным паміж уразнымі і набіўнымі падкоўкамі, змяшчаючы ў сябе характэрныя рысы як аднаго, так і другога тыпу. Такія абутковыя падкоўкі мацаваліся да абцаса пры дапамозе не толькі шыпоў, але і цвікоў. Гэты спосаб мацавання быў характэрным выключна для падковак віду II.

Тып С (малюнак: 12, 13, 17, 19) уяўляе сабой фінальную ступень эвалюцыі абутковай падкоўкі, бо менавіта ён прадугледжваў мацаванне да абцаса выключна цвікамі. Такі спосаб мацавання быў характэрным для падковак віду II.




Мал. 1. Тыпалогія абутковых падковак XV – XVIII стагоддзяў з Полацка

Polotsk.SU

Карэляцыя відаў і тыпаў абутковых падковак XV – XVIII стагоддзяў з Полацка

| **Паводле формы пласціны** | | **Паводле спосабу мацавання** | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | **Тып A** (уразныя) | | **Тып B** (камбінаваныя) | **Тып C** (набіўныя) |
| | | **Тып A I** (двухшыпныя) | **Тып A II** (трохшыпныя) | | |
| **Від I** (пласціна, сплюшчаная ў вертыкальнай плоскасці) | | – | + | – | – |
| **Від II** (пласціна, сплюшчаная ў гарызантальнай плоскасці) | **Варыянт II.1** (чатырохгранная) | + | + | – | + |
| | **Варыянт II.2** (шырокая і плоская) | – | + | + | + |

Цяпер засяродзім нашу ўвагу на датаванні відаў і тыпаў абутковых падковак. Як было адзначана вышэй, першым і найбольш раннім відам падковак у Полацку былі вырабы з высокай, сплюшчанай у вертыкальнай плоскасці пласцінай і трыма шыпамі-мацавальнікамі (від І, тып А ІІ). Гэтыя вырабы датуюцца канцом XV – XVI стагоддзем [2, с. 156; 4, мал. 30: 8]. Вышыня пласціны такіх падковак звычайна вагалася ад 1 да 2,5 см, а таўшчыня ад 0.2 да 0,4 см. Максімальная вышыня шыпа дасягла 3 см.

Другі від абутковых падковак (від ІІ) мае больш шырокі храналагічны дыяпазон бытавання – XVI – XVIII стагоддзі [2, с. 156]. Яго характэрная асаблівасць – сплюшчанасць пласціны ў гарызантальнай плоскасці. Гэтая характарыстыка дапаўняецца яшчэ папярочным сячэннем і шырынёй аснавання ў гарызантальнай плоскасці. Паводле такіх прыкмет вельмі добра вылучаюцца два варыянты падковак другога віду. Вырабы першага варыянта (варыянт ІІ.1) з'яўляюцца адной з найбольш распаўсюджаных груп абутковых падковак. Чатырохгранныя ў сячэнні (квадратныя і прамавугольныя) дугападобныя пласціны з'яўляліся асновай амаль для ўсіх, вылучаных намі тыпаў вырабаў (уразныя і набіўныя). Вышыня іх не прывышае 1 см, а шырыня – 0,5 см.

Ніжняй мяжой існавання віду ІІ.1 можна лічыць XVI, а верхняй – XVIII стагоддзе [2, с. 156 – 157]. Між тым падкоўкі віду ІІ.1 тыпу А з'яўляюцца больш раннімі і датуюцца канцом XVI – XVII сагоддзем, а тыпу В і С – XVII – XVIII стагоддзямі [2, с. 156; 3, мал. 16: 7; 4, мал. 30: 6, 7]. Гэты від абутковых падковак атрымаў найбольшае распаўсюджванне ў дадзены перыяд з-за сваёй значнай эканамічнасці (у параўнанні з падкоўкамі першага віду на іх выраб ішло значна меншая колькасць жалеза) і большай універсальнасці (яны маглі быць як уразнымі, так і набіўнымі).

Падкоўкі другога варыянта паходзяць ад папярэдняй групы вырабаў і адрозніваюцца тым, што іх аснаванне моцна пашыраецца ў гарызантальнай плоскасці (для большай зручнасці вырабы з пласцінай шырэй за 1 см будзем адносіць да другога варыянта). Натуральна, што вялікая шырыня пласціны падкоўкі дазваляла больш надзейна ахоўваць абцас абутку ад сцірання, што абумовіла далейшую эвалюцыю дадзенай катэгорыі вырабаў у гэтым накірунку. Падкоўкі другога варыянта мацаваліся да абцасу з дапамогай як шыпоў, так і цвікоў і атрымалі шырокае распаўсюджванне ў XVII (від ІІ.2, тып В) і XVIII (від ІІ. 2, тып С) стагоддзях [2, с. 156 – 154; 4, мал. 30: 9].

Акрамя таго ў даследаванай намі калекцыі абутковых падковак выяўлены вырабы, якія можна лічыць пераходным варыянтам паміж гэтымі групамі вырабаў. Яны адрозніваюцца ад падковак першага і другога варыянтаў тым, што звычайна маюць моцна пашыраную сярэднюю частку, якая паступова пераходзіць у чатырохгранныя (квадратныя ці прамавугольныя) канцы.

**Заключэнне.** На падставе аналізу рэчавага матэрыялу можна стварыць пэўнае ўяўленне пра развіццё форм абутковых падковак у XV – XVIII стагоддзях. Верагодна, гэтая катэгорыя артэфактаў з'явілася ў г. Полацку напрыканцы XV – пачатку XVI стагоддзя, што было абумоўлена распаўсюджваннем на беларускіх землях абутку на абцасе. Першымі вядомымі формамі абутковых падковак сталі вырабы з высокай, сплюшчанай у вертыкальнай плоскасці пласцінай з трыма шыпамі, якія былі вылучаныя намі ў асобны від – від І. Далейшае развіццё дадзенай катэгорыі вырабаў адбывалася па шляху памяншэння вышыні пласціны і пашырэння яе ў гарызантальнай плоскасці. Гэтая група абутковых падковак была аднесена намі да другога віду (від ІІ). Між тым і ўнутры яго вылучаюцца некалькі варыянтаў, асноўнае адрозненне якіх заключаецца ў папярочным сячэнні і шырыні аснавання.

Падкоўкі першага віду мацаваліся да абцаса пры дапамозе выключна шыпоў, таму гэты спосаб мацавання можна лічыць найбольш архаічным. На аснове пласцін другога віду адбывалася развіццё і іншых спосабаў мацавання падковак да абцаса абутку – пры дапамозе цвікоў (набіўныя), а таксама цвікоў і шыпоў (камбінаваныя). Такія спосабы мацавання былі распаўсюджаныя адначасова. Між тым мацаванне пры дапамозе цвікоў атрымала далейшае развіццё ў больш позні перыяд, у той час як бытаванне камбінаваных падковак абмяжоўваецца XVIII стагоддзем. У сувязі з гэтым камбінаваныя падкоўкі варта разглядаць як пераходны тып ад «уразных» да набіўных.

Такімі чынам, адначасовая камбінацыя вялікага кола характарыстык абутковых падковак не дазваляе стварыць надзейную тыпалагічную схему развіцця гэтай катэгорыі вырабаў. Кіруючыся галоўным правілам лагічнай працэдуры дзялення, за аснову, па якой будзе праводзіцца класіфікацыя, варта браць толькі адну з характарыстык падкоўкі. У той жа час найбольш вызначальнымі маркерамі абутковых падковак уяўляюцца дзве прыкметы – форма аснавання і спосаб мацавання да абцаса. Зыходзячы з функцыянальнага прызначэння дадзенай катэгорыі вырабаў форму аснавання трэба лічыць галоўнай характарыстыкай абутковай падкоўкі, у той час як спосаб мацавання – вытворнай ад яе. У сувязі з гэтым у дадзеным артыкуле прапанавана схема тыпалогіі абутковых падковак, заснаваная на карэляцыі дзвюх азначаных прыкмет. У адпаведнасці з гэтым былі распрацаваныя дзве схемы (гл. табліцу), якія на нашу думку найбольш аб'ектыўна адлюстроўваюць натуральныя сувязі паміж асобнымі экземплярамі даследаванай групы артэфактаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Векслер, А.Г. Обувные подковки XV – XVIII вв. (по материалам раскопок в г. Москве) / А.Г. Векслер, Ю.А. Лихтер, Д.О. Осипов // Российская археология. – 1997. – № 3. – С. 114 – 120.



Polotsk.su

2. Дук, Д.У. Полацк XVI – XVIII стагоддзяў: нарысы тапаграфіі, гісторыі матэрыяльнай культуры і арганізацыі жыццёвай прасторы насельніцтва беларускага горада / Д.У. Дук. – Наваполацк: ПДУ, 2007. – 268 с.
3. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у горадзе Полацку ў 2000 г. / Д.У. Дук, С.В. Тарасаў // Архіў ІГ НАНРБ. – Воп. 1. – Спр. 1880.
4. Дук, Д.У. Справаздача аб палявых археалагічных даследаваннях у горадзе Полацку ў 2001 г. / Д.У. Дук // Архіў ІГ НАНБ. – Воп. 1. – Спр. 1921.
5. Колчин, Б.А. Железообрабатывающее ремесло Новгорода Великого // Материалы и исследования по археологии СССР: тр. Новгород. археолог. эксп. / под ред. Б.А. Колчина и А.В. Арциховского. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – № 65, Т 2. – С. 7 – 120.
6. Изюмова, С.А. К истории кожевенного и сапожного ремёсел Новгорода Великого / С.А. Изюмова // Материалы и исследования по археологии СССР: тр. Новгород. археолог. эксп. / под ред. Б.А. Колчина и А.В. Арциховского. – М.: Изд-во АН СССР, 1959. – № 65, Т 2. – С. 5 – 224.
7. Никитин, А.Ф. Русское кузнечное ремесло XVI – XVII вв. / А.Ф. Никитин. – М.: Наука, 1971. – 84 с.
8. Левко, О.Н. Витебск XIV – XVIII вв.: (Стратиграфия, хронология, социально-историческая топография и технология производств) / науч. ред. В.А. Булкин. – Минск: Наука и техника, 1984. – 120 с.
9. Археалогія Беларусі: у 4 т. / В.М. Ляўко [і інш.]; пад рэд. В.М. Ляўко [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – Т. 4: Помнікі XIV – XVIII стст. – 597 с.
10. Сагановіч, Г.М. Кавальска-слясарскія вырабы з раскопак Крэўскага замка / Г.М. Сагановіч // Сярэдневяковыя старажытнасці Беларусі: Новыя матэрыялы і даследаванні / пад рэд. В.М. Ляўко. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 92 – 98.
11. Сагановіч, Г.М. Кавальскія вырабы сярэдневяковага Мсціслава / Г.М. Сагановіч // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні: зб. арт. / рэд. С.В. Марцэлеў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 183 – 189.
12. Саганович, Г.Н. Кузнечное ремесло Белоруссии XIV – XVIII вв.: дис. ... канд. ист. наук: 07.00.06 / Г.Н. Саганович. – Минск, 1988. – 299 с.
13. Краўцэвіч, А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV – XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / А.К. Краўцэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1991. – 171 с.
14. Трусаў, А.А. Металічныя вырабы з раскопак Лідскага і Мірскага замкаў (XIV – XVIII стст.) / А.А. Трусаў, А.А. Краўцэвіч, Г.М. Сагановіч // Весці АН БССР. Сер. грам. навук. – 1987. – № 4. – С. 73 – 83.
15. Пазднякоў, В.С. Клецк X – XVIII стст.: матэрыяльная і духоўная культура беларус. феад. горада / В.С. Пазднякоў; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: БелНДІДАС, 2008. – 287 с.
16. Дук, Д.В. Кожевенно-сапожное ремесло Полоцка XVI – XVIII вв. (по итогам археолог. надзора на территории Великого посада в 2000 – 2002 гг.) / Д.В. Дук, А.А. Соловьёв // Гіст.-археалаг. зб. – 2004. – № 19. – С. 241 – 250.
17. Ивин. А.А. Логика: учеб. пособие. – 2-е изд. – М.: Знание, 1998. – 240 с.
18. Тыпалогія // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / Беларус. Энцыкл.; рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: Бел.Эн., 1993. – С. 621 – 622.

## КУРГАННЫ МОГІЛЬНІК ПАГОШЧА: АСНОЎНЫЯ ВЫНІКІ РАСКОПАК 2005 – 2008 ГАДОЎ

*М.А. ПЛАВІНСКІ*
*(Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Мінск)*

*Прадстаўлены вынікі раскопак курганнага могільніка Пагошча Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, якія праводзіліся экспедыцыяй пад кіраўніцтвам аўтара на працягу 2005 – 2008 гадоў. Пачатак функцыянавання помніка прыпадае на трэцюю чвэрць I тыс. н.э. і звязаны са з'яўленнем у Браслаўскім Паазер'і носьбітаў культуры пскоўскіх доўгіх курганоў. Большасць даследаваных курганоў належыць да другой паловы канца X – пачатку першай паловы XI стагоддзя (найбольш верагодна – апошнімі дзесяцігоддзямі X – пачаткам XI ст.). Могільнік належаў калектыву, які ўключаў розных па паходжанні і этнакультурнай прыналежнасці членаў. Сярод іх дамінуючае становішча займалі прадстаўнікі полацкай княжацкай адміністрацыі, якія мелі пэўнае карпаратыўнае ўяўленне аб прэстыжным пахавальным абрадзе інгумацыі ў «камерах».*

Курганны могільнік Пагошча знаходзіцца ў лесе за 500 м на паўночны ўсход ад вёскі Пагошча (Опсаўскі с/с Браслаўскага р. Віцебскай вобл.) на ўсходнім беразе возера Бяржонка (мал. 1). Помнік размешчаны на тэрасе, якая ўзвышаецца над возерам Бяржонка прыкладна на 3 м. Курганы выцягнуты паміж схілам тэрасы і лясной дарогай. Могільнік зарос лесам (сосны, бярозы) і кустоўем (арэшнікам). Уся яго плошча моцна пацярпела ад гаспадарчай актыўнасці людзей. Большасць курганоў пашкоджана і



Polotsk.SU